# АСАБЛІВАСЦІ АЙКАНІМІІ БАБРУЙСКАГА РАЁНА МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ

***Хацько А.А.*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, г. Мазыр)*
***Навуковы кіраўнік –*** *В.В. Шур, д-р філал. навук, прафесар*

Айканімія Бабруйшчыны часткова засведчана і часткова растлумачана ў працах Я. Адамовіча, М. Бірылы, В. Жучкевіча, В. Лемцюговай, Л. Лыча, Я. Рапановіча, А. Рогалева, В. Рагаўцова, Г. Рылюка, В. Шура, І. Яшкіна і інш. Усіх аконімаў у Бабруйскім раёне 225. У сваёй працы мы прааналізавалі 50 назваў.

Паводле лексіка-семантычнай характарыстыкі асноў гэтыя адзінкі падзяляюцца на: 1) айконімы ***адапелятыўнага*** паходжання (70,2%); 2) айконімы ***адантрапанімнага*** паходжання (28,6%); 3) айконімы ***адгідранімнага*** паходжання (2,2%).

У айканіміі Бабруйшчыны найбольш прадуктыўнымі і рэгулярнымі з'яўляюцца наступныя тапафарманты: **-аўк-, -оўк-, -еўк-, -іўк-** (13,8%): *Іванаўка*; **-ава-, -ова-, -ева-, -іва-** (11,8%): *Сычкава*; **-ічы-** (9,7%): *Атрашковічы*; **-ін-, -ын-** (6,1%): *Бабіна*; **-шчына** (4,6%): *Бібкаўшчына*; **-je**



МГПУ им. И.П.Шамякина

(усходнеславянскі суфікс, які ў беларускай мове трансфармаваўся, выклікаўшы падаўжэнне зычных): *Забалоцце* (2%).

Аналіз матывацыі айконімаў Бабруйскага раёна, ідэй, якія пакладзены ў аснову намінацый, дазваляе вызначыць наступныя іх тыпы: 1) ***антрапаайконімы*** (*Савічы* і інш.); 2) ***штучныя айконімы*** (*Юбілейны* і інш.); 3) ***кваліфікатыўныя назвы*** (*Стары Двор* і інш.); 4) ***ландшафтныя айконімы*** (*Астравы* і інш.); 5) ***мемарыяльныя назвы*** (*Калініна* і інш.); 6) ***паесіўныя айконімы*** (*Юр'ева* і інш.).

***Складаныя*** і ***састаўныя*** айконімы засведчаны даволі нешматлікай колькасцю назваў: 2 складаныя (*Рагаселле, Навасёлкі*) і 28 састаўных, якія ў сваёй большасці характарызуюцца структурнай схемай "якасны прыметнік + назоўнік" (*Вялікая Кантора, Вялікія Бортнікі, Малыя Бортнікі, Стары Двор, Чырвоная Зара, Ясны Лес і інш.).*

Узор апісання айконімаў: **Панюшкавічы**, мн., Р. –іч/-чаў – вёска ў Сычкаўскім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Бабруйск. Вядома з XVII ст. Як адзначае В. Лемцюгова, *Панюшкавічы* – нашчадкі чалавека па імені або прозвішчы ***Панюшка*** (Панюш) – скарочаная гутарковая форма ад царкоўнага праваслаўнага імя *Пантелеймон* (з грэч. *Panteleemon* – дасканаласць). Вёска *Панюшкавічы* – радзіма *Вінцэнта Іванавіча Дуніна-Марцінкевіча* (1808 – 1884 г.) – класіка беларускай літаратуры.



МГПУ им. И.П. Шамякина